УДК 37

# ВЫХАВАННЕ ВУЧНЯЎ НА ЎРОКАХ БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ З УЛІКАМ ГЛАБАЛІЗАЦЫІ Ў СУЧАСНЫМ СВЕЦЕ

**В. В. Конан**
*Гімназія № 15 г. Мінска,*
*г. Мінск, Рэспубліка Беларусь, creative_persona888@mail.ru*

У артыкуле разглядаецца значэнне выхавання вучняў на ўроках літаратуры ў кантэксце глабалізацыі, якая ўплывае на культурныя і адукацыйныя працэсы. Абгрунтоўваецца думка, што літаратура – гэта не толькі мастацтва слова, але і важны сродак для разумення розных каштоўнасцяў і праблем сучаснага свету. Асаблівая ўвага надаецца інтэграцыі глабальных тэм у навучальны працэс. Паказана ключавая роля ўрокаў літаратуры ў выхаванні вучняў, развіцці іх крытычнага мыслення, культурнай свядомасці і грамадзянскай адказнасці. Прапаноўваюцца канкрэтныя прыклады твораў, якія вучаць жыццёвай мудрасці і далучаюць вучняў да важных маральных каштоўнасцяў. Артыкул будзе карысным для настаўнікаў, даследчыкаў і ўсіх, хто цікавіцца пытаннямі выхавання і адукацыі.

***Ключавыя словы:*** выхаванне вучняў; глабалізацыя; урокі літаратуры; крытычнае мысленне; актуальныя праблемы.

# EDUCATION OF STUDENTS IN THE LESSONS OF BELARUSIAN LITERATURE TAKING GLOBALIZATION INTO THE MODERN WORLD

**V. V. Conan**
*Gymnasium No. 15, Minsk,*
*Minsk, Republic of Belarus, creative_persona888@mail.ru*

The article examines the importance of educating students in literature lessons in the context of globalization, which affects cultural and educational processes. The idea is substantiated that literature is not only the art of words, but also an important tool for understanding various values and problems of the modern world. Special attention is paid to the integration of global topics into the educational process. The key role of literature lessons in education of students, development of their critical thinking, cultural awareness and civic responsibility is shown. Specific examples of works that teach life wisdom and connect students to important moral values are offered. The article will be useful for teachers, researchers, and anyone interested in parenting and education.

***Keywords***: education of students; globalization; literature lessons; critical thinking; actual problems.

Выхаванне маральных якасцей асобы, этычных паводзін і ўнутранай культуры – актуальнае і надзённае пытанне для цяперашняга часу, бо сёння нярэдка адбываецца падмена каштоўнасных арыентацый, назіраюцца праявы бездухоўнасці, абыякавасці і эгаізму. Сродкі масавай інфармацыі, асабліва інтэрнэт, часам папулярызуюць далёка не лепшыя эталоны і прыклады норм жыцця і паводзін. Моладзь – будучыня грамадства, а значыць, ад яе залежыць стан культуры і маралі, лёс сямейных каштоўнасцяў, традыцый і інш.

Сучасны свет характарызуецца актыўным працэсам глабалізацыі, які ўплывае на ўсе аспекты нашага жыцця, уключаючы адукацыю і культуру. Хуткія змены закранаюць усе сферы жыцця, спрыяюць інтэграцыі культур, моў і ідэй, ставяць перад сістэмай адукацыі новыя выклікі і магчымасці [1]. У гэтым кантэксце ўрокі беларускай літаратуры становяцца важным інструментам для выхавання вучняў, якія павінны навучыцца арыентавацца ў шматкультурным свеце. Такія ўрокі спрыяюць фарміраванню нацыянальнай самасвядомасці вучняў, іх культурнай ідэнтычнасці.

Адна з галоўных задач выхавання на ўроках літаратуры — развіццё крытычнага мыслення вучняў. Вельмі важна на прыкладзе мастацкіх твораў паказаць прыклады станоўчых узаемаадносін у сям'і, а таксама папярэдзіць пра наступствы няправільна пабудаваных сямейных адносін. Чытанне твораў розных аўтараў дазваляе ім аналізаваць і параўноўваць погляды на жыццё, мараль, этыку. Гэта спрыяе фармаванню ўмення крытычна ацэньваць інфармацыю, што асабліва важна ў эпоху глабальнай інфармацыйнай перагрузкі.

Беларуская літаратура – гэта адлюстраванне духоўнага жыцця народа, яго гісторыі і культуры. На ўроках беларускай літаратуры вучні не толькі знаёмяцца з мастацкімі творамі, але і атрымліваюць магчымасць асэнсаваць каштоўнасці, якія яны нясуць. Напрыклад, творы Янкі Купалы, такія як “Курган” і “Адвечная песня” падкрэсліваюць важнасць сямейных каштоўнасцяў і нацыянальнай самасвядомасці. У сучасным свеце гэтыя тэмы не губляюць сваёй актуальнасці [2].

А тэма маці? Амаль кожны з беларускіх пісьменнікаў закранае гэтую тэму. Адносіны чалавека да сваіх бацькоў з'яўляюцца асноўнай меркай яго вартасці, унутранага самавыражэння.

Змітрок Бядуля стварыў выдатнае апавяданне “На Каляды к сыну”, якое моцна ўзрушвае чытачоў сваім жыццёвым сюжэтам. Сын разбагацеў, перастаў думаць пра бацькоў, цураецца сваёй маці – неадукаванай, простй, хворай жанчыны. Трагедыя Тэклі абвастраецца яшчэ і тым, што дзеянне адбываецца ў час святкавання Каляд, калі дапамагаюць і спачуваюць нават чужым. Лаўрук жа спрабуе адкупіцца ад матчынай любові грашыма.

Часта даводзілася бачыць слёзы на вачах вучняў пасля прачытання гэтага апавядання. Ці ж не па-сучаснаму надзённа гучыць твор?

Адносіны да бацькоў – галоўны крытэрый чалавечнасці. Праблема адчужэння дзяцей ад бацькоўскага дома, ад родных вытокаў і каранёў, страта адказнасці за жыццё пакінутай маці глыбока раскрыта ў творах беларускай літаратуры.

Ключавым элементам культуры і выхавання з'яўляецца мова. На ўроках беларускай літаратуры важна заахвочваць вучняў карыстацца беларускай мовай у паўсядзённым жыцці. Напрыклад, падчас вывучэння творчасці Васіля Быкава можна правесці дыскусію пра актуальнасць яго твораў у сучасным свеце і іх уплыў на фарміраванне нацыянальнай самасвядомасці.

Глабалізацыя не толькі стварае новыя магчымасці для навучання, але і ставіць перад намі задачу захаваць нацыянальную культуру і традыцыі народа.

Урокі беларускай літаратуры павінны інтэграваць з элементамі сусветнай літаратуры. Напрыклад, параўноўваючы творы беларускіх пісьменнікаў з сусветнымі класікамі, вучні могуць убачыць агульныя тэматычныя матывы. У гэтым кантэксце можна разгледзець творчасць Максіма Багдановіча і паэзію Аляксандра Блока, дзе абодва аўтары даследуюць тэму пошуку сэнсу жыцця. Такім чынам, вучні не толькі пашыраюць свой культурны гарызонт, але і развіваюць павагу да іншых прадстаўнікоў літаратурнага свету.

Урокі літаратуры могуць быць платформай для абмеркавання актуальных сацыяльных і палітычных праблем, якія адлюстроўваюцца ў творах. Дыскусіі на такія тэмы спрыяюць фармаванню актыўнай грамадзянскай пазіцыі вучняў, развіццю іх здольнасці да аргументацыі і абароны сваіх поглядаў. Гэта важна для таго, каб маладыя людзі сталі адказнымі грамадзянамі ў глабалізаваным свеце.

Літаратура таксама адыгрывае важную ролю ў развіцці эмоцый і пачуццяў вучняў. Чытанне мастацкіх твораў дазваляе ім перажыць розныя эмоцыі, што спрыяе развіццю эмпатыі і разумення чужых пачуццяў. У сучасным свеце, дзе часта пануе індывідуалізм, гэтая якасць становіцца ўсё больш важнай.

Увогуле, духоўны патэнцыял літаратуры бязмежны. Абмеркаванне вечных і актуальных праблем – гэта магчымасць зазірнуць ва ўласны ўнутраны свет, глыбей спазнаць жыццё, вучыцца жыць і наладжваць адносіны, выхоўваць сябе.

Глабалізацыя таксама прыносіць новыя тэхналогіі, якія могуць быць выкарыстаны на ўроках літаратуры. Інтэрактыўныя платформы, анлайн-бібліятэкі і адукацыйныя прыкладанні дазваляюць вучням атрымліваць доступ да шырокага спектра літаратурных твораў і рэсурсаў. Гэта не толькі робіць навучанне больш цікавым, але і спрыяе самастойнаму вывучэнню.

На жаль, у цяперашні час не так шмат свядомых чытачоў. Далёка не кожны любіць мастацкае слова, умее браць ад літаратуры патрэбнае, чэрпае з яе думкі і пачуцці. Менавіта таму ў першую чаргу ад настаўніка залежыць матывацыя вучняў да чытання, цікавасць да беларускай кнігі. Пры разглядзе праграмных твораў неабходна запыняцца на праблемах у літаратурных творах, якія хвалююць дзяцей, выклікаюць жывую рэакцыю, глыбокія пачуцці, меркаванні, думкі-разважанні.

Урокі беларускай літаратуры – гэта важны этап у выхаванні патрыятызму і культурнай самасвядомасці вучняў. Урокі літаратуры ў сучасным свеце павінны стаць не толькі месцам для вывучэння твораў мастацтва, але і платформай для выхавання адказных, крытычна мыслячых і культурна адчувальных грамадзян. Улічваючы глабалізацыю, настаўнікі павінны выкарыстоўваць усе магчымасці, каб падрыхтаваць вучняў да жыцця ў шматкультурным і дынамічным свеце. Толькі так мы зможам забяспечыць будучыню, у якой павага да разнастайнасці стане нормай.

## Спіс выкарыстаных крыніц

1. Глабалізацыя. [Электронны рэсурс] / Нацыянальны адукацыйны партал. – Рэжым доступу : http://profil.adu.by/mod/book/view.php?id=5738&chapterid=19663. – Дата доступу : 17.11.2024.

2. Нікалаенка, Г. Навукова-метадычныя аспекты працэсу семантызацыі духоўна-маральных паняццяў і катэгорый: З вопыту рэалізацыі інавацыйнага праекта / Г. Нікалаенка, І. Таяноуская, М. Варакса, Т. Пашковіч // Роднае слова. – 2024. – № 3. – С. 58–63.

УДК 373.6